# МОЎНАЯ АСОБА

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

В. Ч. Хвайніцкая

**Моўная асоба** – гэта любы носьбіт той ці іншай мовы, ахарактарызаваны на аснове аналізу ствараемых ім тэкстаў з пункта гледжання выкарыстання ў гэтых тэкстах сістэмных сродкаў пэўнай мовы для адлюстравання бачання носьбітам навакольнай рэчаіснасці і для дасягнення вызначаных мэт у гэтым

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Тэрмін **«моўная асоба»** ўпершыню з’явіўся ў годзе ў кнізе нямецкага мовазнаўцы **Й. Л. Вайсгербера** *«Родная мова і фармаванне духу»*.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

У сваім разуменні мовы Й. Л. Вайсгербер рабіў акцэнт на калектывізм.

На думку **Й. Л. Вайсгербера**, *мова з'яўляецца найбольш агульным культурным здабыткам*.

Чалавек валодае мовай дзякуючы таму, што належыць да пэўнай моўнай супольнасці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# Калектыўная моўная асоба

Моўная асоба ўключае прыкметы вялікіх і малых груп, у склад якіх яна ўваходзіць. У першую чаргу, гэта прыналежнасць да чалавецтва як адзінага цэлага.

Універсальныя рысы, уласцівыя карыстальніку мовы як суб’екту камунікацыі, абумоўліваюць адзінства чалавецтва.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# Індывідуальная моўная асоба

Індывідуальная моўная асоба рэалізуецца на ўзроўні ідыялекта.

Па думку В. У. Вінаградава, ***ідыялект*** – сукупнасць фармальных і стылістычных асаблівасцей, уласцівых для маўлення асобнага носьбіта дадзенай мовы.

А. А. Лявонцьеў лічыць, што ідыялект ўяўляе сабой «персанальную» лінгвістычную сістэму канкрэтнага камуніканта, з варыяцыямі на фаналагічным, граматычным і лексічным узроўнях. Кожны ідыялект непаўторны, як адбіткі пальцаў. На яго характар уплывае мноства фактараў: узрост, сацыяльнае становішча, месца жыхарства, псіхатып, фізіялагічныя асаблівасці і гэтак далей, якія ў сукупнасці ўтвараюць нешта, што называецца *індывідуальнасцю*.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГТУ

У рускамоўнай навуковай літаратуры тэрмін **«моўная асоба»** быў упершыню выкарыстаны **В. У. Вінаградавым** у працы *«Аб мастацкай прозе»* ( ).

*В. У. Вінаградаў* аналізаваў літаратурныя творы з пункту гледжання як чытача, так і аўтара. Пры гэтым вывучэнне пазіцыі аўтара ён лічыў задачай даследчыка, які як бы становіцца на месца аўтара. Асноўнай катэгорыяй такога аналізу становіцца вобраз аўтара, які разглядаецца ў кантэксце яго творчасці ў цэлым, стылю,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Нягледзячы на тое, што навукоўцы ўжывалі тэрмін, навуковага вызначэння яму не было дадзена.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Актыўная распрацоўка феномена **«моўная асоба»** пачалася ў -я гады . стагоддзя расійскімі навукоўцамі ***Ю. М. Каравулавым*** *і* ***Г. І. Богіным***.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

На думку ***Ю. М. Караулава***, ***моўная асоба*** -- гэта «*шматслаёвы і шматкампанентны набор моўных здольнасцей, уменняў, гатоўнасць да ажыццяўлення маўленчых учынкаў рознай ступені складанасці, учынкаў, якія падзяляюцца па відах маўленчай дзейнасці (аўдзіраванне, маўленне, чытанне, пісьмо) і па ўзроўнях мовы...*»

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Моўная асоба** - гэта сукупнасць здольнасцей чалавека, якія абумоўліваюць стварэнне і ўспрыманне ім маўленчых твораў, розных па ступені структурна-моўнай складанасці, глыбіні адлюстравання рэчаіснасці, пэўнай мэтавай накіраванасці.

*Ю. М. Каравулаў*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# Узроўні моўнай асобы

- **Вербальна-семантычны ўзровень** прадугледжвае адвольнае валоданне носьбітам мовай.
- **Кагнітыўны ўзровень**, адзінкамі якога з’яўляюцца паняцці, ідэі, канцэпты, якія складваюцца ў кожнай моўнай індывідуальнасці ў больш ці менш упарадкаваную, больш ці менш сістэматызаваную «карціну свету», адлюстроўвае іерархію каштоўнасцей. Кагнітыўны ўзровень ахоплівае інтэлектуальную сферу асобы, дэманструе працэсы пазнання чалавека, выхад праз мову, праз працэсы маўлення і разумення да ведаў, свядомасці.
- **Прагматычны ўзровень** уключае мэты, матывы, інтарэсы, устаноўкі. Гэты ўзровень забяспечвае ў аналізе моўнай асобы заканамерны пераход ад ацэнак яе маўленчай дзейнасці да асэнсавання рэальнай дзейнасці ў свеце.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

На думку Ю. М. Каравулава, узроўні залежаць адзін ад другога, але гэтая залежнасць далёка не простая і не адназначная.

Веданне сродкаў і асаблівасцей функцыянавання вербальна-семантычнага ўзроўню пэўнай асобы яшчэ не з’яўляецца падставай для вывадаў аб моўнай мадэлі свету, г. зн., што ад лексікону асобы нельга перайсці непасрэдна да яе тэзаўрусу, а веданне тэзаўрусу асобы не з’яўляецца падставай для вывадаў аб матывах і мэтах, якія кіруюць яе тэкстамі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Для пераходу ад аднаго ўзроўню да другога неабходна дадатковая лінгвістычная інфармацыя, якая пастаўляецца сацыяльнымі складнікамі мовы. На аснове гэтай інфармацыі ад вербальна-семантычнага ўзроўню магчыма перайсці да лінгвакагнітыўнага. Для пераходу да матывацыйна-прагматычнага ўзроўню неабходна дадатковая інфармацыя аб сацыяльным функцыянаванні моўнай асобы, аб яе сацыяльных ролях і рэферэнтных групах.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Поўнае апісанне моўнай асобы з мэтай яе аналізу ці сінтэзу **прадугледжвае**:

) характарыстыку семантыка-страявога ўзроўню яе арганізацыі (вычарпальнае альбо дыферэнцыяльнае яго апісанне, фіксуе толькі індывідуальныя адрозненні і ажыццяўляецца на фоне асераднёнага прадстаўлення дадзенага моўнага ладу);

) рэканструкцыю моўнай мадэлі свету, або тэзаўрус дадзенай асобы (на падставе створаных ёю тэкстаў або на падставе спецыяльнага тэсціравання);

) выяўленне яе жыццёвых або сітуатыўных дамінант, матываў, установак, якія знаходзяць адлюстраванне ў працэсах спараджэння тэкстаў і ў іх змесце, а таксама ў

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

У межах міжкультурнай камунікацыі моўную асобу можна аналізаваць з пункту гледжання калектыўнасці і індывідуальнасці. Па думку А. А. Лявонцьева, культурна-моўная асоба ўяўляе сабой адзінства калектыўнага і індывідуальнага, якія існуюць у непарыўнай сувязі.

З аднаго боку, калектыўная памяць і калектыўныя аспекты мовы складаюцца з шматразова паўторанага індывідуальнага вопыту – складанай мазаікі індывідуальных украпванняў, словаўжывання, камунікатыўных стратэгій і інш.

З другога боку, індывідуальная асоба фармуецца на аснове калектыўнага вопыту і калектыўнай памяці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## Калектыўная моўная асоба

Моўная асоба належыць да якой-небудзь моўнай супольнасці. Напрыклад, англійская, нямецкая, французская ці іспанская моўная асоба не толькі належыць да супольнасці людзей, якія пражываюць кампактна, але і ўключае далёка размешчаныя дзяржавы, дзе людзі гавораць па-англійску, па-нямецку, па-французску ці па-іспанску. Такім чынам, носьбітам гэтых моў характэрны рысы, агульныя для ўсіх жыхароў краін, што размаўляюць на адпаведных мовах.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Такім чынам, у паняцці моўнай асобы фіксуецца сувязь мовы з індывідуальнай свядомасцю асобы, са светапоглядам. Любая асоба праяўляе сябе і сваю суб'ектнасць не толькі праз прадметную дзейнасць, але і праз зносіны, якія немагчыма рэалізаваць без мовы і маўлення.

Маўленне чалавека з непазбежнасцю адлюстроўвае яго ўнутраны свет, служыць крыніцай ведаў аб яго асобе. Відавочна, што «чалавека нельга вывучаць па-за мовай», паколькі, нават з абывацельскага пункта гледжання, цяжка зразумець, што ўяўляе сабой чалавек, пакуль мы не пачуем, як і што ён кажа. Але таксама немагчыма «мову разглядаць у адрыве ад чалавека», бо без асобы, якая гаворыць на пэўнай мове, мова застаецца не больш чым сістэмай знакаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# Літаратура:

1. Караулов, Ю. Н. Русский язык и языковая личность / Ю. Н. Караулов. – М. : ЛКИ, 2010. – 264 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ